ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка"

УДК 947.085(476)

Жылінскі Марат Генадзьевіч

# АДУКАЦЫЯ НА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
## (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.)

07.00.02 – "айчынная гісторыя"

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Мінск – 2002

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар Мацко А.М. (Установа адукацыі: БДПУ імя М. Танка, кафедра гісторыі Беларусі)

доктар гістарычных навук, прафесар Каваленя А.А. (Установа адукацыі: БДПУ імя Максіма Танка, кафедра айчыннай і сусветнай гісторыі)

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук Лемяшонак У.І. (галоўны рэдактар арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных хронік Памяць Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку)

кандыдат гістарычных навук, дацэнт Кузьменка У.І. (аддзел ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі).

Абарона адбудзецца кастрычніка 2002 г. у 14 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482; тэл. 2208633.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Аўтарэферат разасланы 25 верасня 2002 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый І.І. Баргановіч

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Тэма Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. застаецца актуальнай. Нягледзячы на тое, што ў савецкай і айчыннай гістарыяграфіі існуе вялікая колькасць навуковых прац, у якіх асэнсоўваюцца самыя розныя праблемы ваеннага мінулага Беларусі, па-за сферай інтарэсаў даследчыкаў засталіся многія пытанні. Аналіз апублікаваных крыніц сведчыць, што праблема адукацыі і выхавання падрастаючага пакалення на акупіраванай тэрыторыі Беларусі не з'яўляецца новай у гістарыяграфіі. У даследаваннях узнімаліся розныя бакі пытання, аднак у комплексе праблема не вывучалася. Асноўная ўвага надавалася асвятленню арганізацыі і дзейнасці савецкіх школ у тыле ворага. У 90-я гг. XX ст. з'явіўся шэраг навуковых прац, у якіх даследчыкі імкнуліся больш шырока асвятліць дзейнасць акупацыйных улад у галіне адукацыі. Між тым, нягледзячы на існаванне багатых архіўных матэрыялаў, праблема застаецца слаба вывучанай і знаходзіцца на пачатковым этапе навуковага разгляду.

Распрацоўка праблемы мае навукова-тэарэтычны інтарэс і пэўную практычную значнасць. Ва ўсе часы школа ў грамадстве была не толькі грамадскім адукацыйным інстытутам, але і ідэалагічнай установай, якая задавальняла палітычныя патрэбы краіны, выконвала неабходныя выхаваўчыя функцыі, фарміравала светаадчуванне, жыццёвыя ідэалы і каштоўнасці. Таму вывучэнне вопыту дзейнасці сістэмы адукацыі будзе цікавіць гісторыкаў і палітыкаў розных пакаленняў і, магчыма, дапаможа пазбегнуць памылак і пралікаў у гэтай сферы і сёння.

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя з'яўляецца часткай Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі "Даследаванне гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі" па тэме "Моладзь у сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі XX ст.", якая ўключана ў якасці самастойнага раздзела ў тэму "Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах XX ст.". Рэгістрацыйны нумар – 2001 4685[1].

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – на аснове выкарыстання шырокага кола архіўных матэрыялаў і апублікаваных крыніц правесці комплексны і сістэмны аналіз адукацыйных працэсаў, якія мелі месца на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.)

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных задач:

- высветліць стан вывучэння і ступень распрацоўкі ў гістарычнай навуцы праблемы адукацыі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ахарактарызаваць асноўныя архіўныя крыніцы і навуковыя працы па тэме даследавання;
- прааналізаваць становішча адукацыйнай сістэмы Беларусі напярэдадні і ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны, вызначыць сутнасць дзейнасці першых германскіх акупацыйных органаў адукацыі;
- раскрыць мэты і задачы германскіх улад у галіне адукацыі, выявіць структуру адукацыйнай сістэмы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, адзначыць яе асаблівасці ў рэгіёнах, што ўваходзілі ў розныя тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі "трэцяга рэйха";

[1] План важнейшых навукова-даследчых работ у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных і сацыяльных навук і мастацтваў у Рэспубліцы Беларусь на 2001–2005 гады: У 2 ч.– Мн., 2001.– Ч. 1.– С. 681–682.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


- вызначыць колькасныя і якасныя параметры ў дзейнасці акупацыйнай сістэмы адукацыі (агульную колькасць навучальных установ, навучэнцаў, настаўнікаў), формы і сутнасць навучальна-выхаваўчага працэсу, яго метадычнае забеспячэнне, мэтанакіраваныя спробы ідэйна-палітычнай арыентацыі падрастаючага пакалення Беларусі, адлюстраваць працэс уцягнення моладзі ў вырашэнне ваенна-палітычных задач нацысцкай Германіі;
- даследаваць ваенна-палітычную сітуацыю на захопленай тэрыторыі Беларусі, адзначыць уплыў дзейнасці партызан і падпольшчыкаў на стан і развіццё акупацыйнай сістэмы адукацыі, ідэалагічнае супрацьстаянне, барацьбу за падрастаючае пакаленне.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам вывучэння з'яўляецца гісторыя Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.). Прадметам даследавання выступаюць германская акупацыйная і савецкая сістэмы адукацыі і іх асноўныя напрамкі дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў чэрвені 1941 – ліпені 1944 г.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Метадалагічную аснову дысертацыі склалі прынцыпы гістарычнага даследавання: аб'ектыўнасць, гістарызм, навуковасць, сістэмнасць. Для вырашэння пастаўленых задач аўтар выкарыстоўваў гісторыка-параўнальны метад, які садзейнічаў асэнсаванню структуры сістэм адукацыі ў розных рэгіёнах Беларусі, дапамог выявіць падобныя рысы і адрозненні паміж імі. Даследаванне праведзена і з выкарыстаннем гісторыка-тыпалагічнага метаду, які спрыяў комплекснаму асэнсаванню гістарычных падзей, вылучэнню аднародных стадый іх развіцця, вызначэнню агульнасці рыс. Узяўшы пад увагу гісторыка-сістэмны метад, аўтар імкнуўся адзначыць уплыў усяго комплексу гістарычных падзей на дыялектыку адукацыйнай сістэмы на аснове ўстанаўлення паміж імі функцыянальных сувязяў. Гісторыка-генетычны метад дазволіў даследаваць працэс развіцця гістарычных падзей ад іх зараджэння, развіцця і вынікаў.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў.** Існаванне адукацыйных працэсаў на захопленай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца адной з малавядомых старонак у беларускай гісторыі.

Навуковая навізна дысертацыі заключаецца ў тым, што:

- даследаванне будуецца на ўвядзенні ў навуковы ўжытак шэрагу архіўных дакументаў і матэрыялаў, якія да гэтага часу не выкарыстоўваліся;
- вызначаны комплекс праблем, у якіх разглядаюцца генезіс, развіццё і структура германскай адукацыйнай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
- атрыманы новыя даныя аб заснаванні і дзейнасці на акупіраванай тэрыторыі Беларусі аддзелаў культуры, адукацыі, моладзі як у структуры Генеральнага камісарыята Беларусі, так і ў акруговых камісарыятах, а таксама іншых рэгіёнах акупіраванай Беларусі, раскрыты раней невядомыя напрамкі іх дзейнасці ў сферы навучальна-выхаваўчай работы з маладым пакаленнем;
- адлюстравана дынаміка адукацыйнай палітыкі германскіх акупацыйных улад, вызначана яе цесная сувязь са зменамі ваеннага становішча на франтах, адносіны нямецкіх улад да падрастаючага пакалення Беларусі;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

- удакладнена колькасць дзеючых на захопленай тэрыторыі Беларусі навучальных установ, настаўнікаў, якія працавалі ў іх, вучняў, што наведвалі школы, раскрыты формы і сутнасць навучальна-выхаваўчага працэсу;
- паказана ідэалагічнае супрацьстаянне германскіх акупацыйных улад і беларускіх партызан і падпольшчыкаў іх барацьба за падрастаючае пакаленне Беларусі, роля савецкіх школ, што былі адкрыты і працавалі ў тылу ворага.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыял дысертацыі будзе карысным у працэсе далейшага правядзення фундаментальных даследаванняў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пры напісанні агульных прац па гісторыі Беларусі, падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, асабліва раздзелаў, якія прысвечаны перыяду акупацыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Высновы і матэрыял даследавання могуць выкарыстоўвацца пры распрацоўцы лекцый і спецкурсаў, асабліва тых, што тычацца праблем перыяду германскай акупацыі Беларусі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Нападзенне Германіі на СССР у чэрвені 1941 г., няўдачы войскаў Чырвонай Арміі ў пачатку вайны патрабавалі ад саюзнага і рэспубліканскага кіраўніцтва не толькі неадкладнай эвакуацыі матэрыяльных каштоўнасцяў, але і выратавання жыцця дзяцей, асабліва тых, якія выхоўваліся ў дзяржаўных дзіцячых установах. Аднак хуткасць развіцця падзей на фронце на карысць армій германскага вермахта не дазволіла належным чынам арганізаваць работу па эвакуацыі дзяцей на ўсход Савецкага Саюза. Агульнымі намаганнямі кіруючых органаў, выхавацелямі дзіцячых установ, настаўнікамі, урачамі, прадстаўнікамі інтэлігенцыі, працоўнымі ў чэрвені – жніўні 1941 г. з БССР было эвакуіравана толькі каля 15 % беларускіх дзяцей да 16 гадоў. Тым не менш, большая частка дзяцей засталася на акупіраванай тэрыторыі Беларусі і разам з дарослымі пераносіла ўсе цяжкасці ваеннага часу.

У перыяд баявых аперацый па захопу Беларусі была ліквідавана савецкая сістэма адукацыі, мела месца масавае знішчэнне дзяцей, настаўнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі, разбураліся школьныя будынкі і іншыя навучальныя ўстановы, рабавалася іх матэрыяльная база.

2. У чэрвені – жніўні 1941 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі гаспадарылі германскія часовыя вайсковыя ўлады, якія не займаліся пытаннямі арганізацыі адукацыйнай сістэмы і не мелі наконт гэтага ніякіх установак з цэнтра. Іх дзейнасць абмяжоўвалася ў асноўным вырашэннем ваенна-эканамічных задач, правядзеннем падрыхтоўча-арганізацыйных мерапрыемстваў па стварэнні належных умоў функцыяніравання германскіх акупацыйных органаў улады. Тым не менш, нягледзячы на адсутнасць загадаў у адукацыйнай сферы, ваеннае кіраўніцтва не забараняла мясцовым уладам распачынаць школьную справу.

3. Ужо ў пачатку дзейнасці германскай грамадзянскай улады, на захопленай тэрыторыі Беларусі былі праведзены мерапрыемствы па наладжванні акупацыйнай сістэмы адукацыі, стварэнні яе органаў кіравання. Улады нацысцкай Германіі бачылі ў школьнай сістэме інстытут, які павінен быў пазбавіць падрастаючае пакаленне Беларусі ўплыву камуністычнай ідэалогіі і выхаваць яго ў духу нацыянал-сацыялізму, уцягнуць беларускую моладзь у сферу германскіх ваенна-эканамічных інтарэсаў і тым самым стварыць перадумовы для экспарту ідэй нацыянал-сацыялізму. Маладое пакаленне

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

павінна было стаць апорай у далейшай рэалізацыі экспансіўнай акупацыйнай палітыкі Германіі на ўсходніх тэрыторыях.

4. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана сетка курсаў і навучальных устаноў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў. Новая генерацыя педагогаў заклікалася не толькі да авалодання спецыяльнымі ведамі, але ў першую чаргу да засваення ідэй нацыянал-сацыялізму, сродкаў і метаду яго ўкаранення ў навучальна-выхаваўчы працэс.

5. Пры падтрымцы калабарацыяніецкіх колаў германскія акупацыйныя ўлады наладзілі працу сеткі школьных пачатковых, сярэдніх і спецыяльных устаноў. Іх колькасць абмяжоўвалася развіццём ваенна-палітычнай сітуацыі на савецка-германскім фронце і акупіраванай тэрыторыі Беларусі, асабліва ўплывам дзейнасці партызан і падпольшчыкаў супраць германскіх агрэсараў.

Навучальна-выхаваўчы працэс меў адметную нацыянальна-прапагандысцкую афарбоўку і нацысцкую сутнасць, быў накіраваны на падрыхтоўку неабходных ваенна-эканамічных кадраў дзеля паспяховай рэалізацыі палітыкі Германіі на ўсходзе.

6. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі разгарнулася вострая ідэалагічная барацьба за падрастаючае пакаленне. Падпольныя партыйныя і камсамольскія органы прыкладвалі ўсе намаганні па зрыве германскай адукацыйнай палітыкі. У партызанскіх зонах былі арганізаваны і дзейнічалі школы, у якіх навучанне вялося па савецкіх праграмах, выхаваўчы працэс будаваўся на камуністычных ідэях, нянавісці да германскіх акупантаў, адданасці Радзіме.

Мэтанакіраваная дзейнасць партызан і падпольшчыкаў садзейнічала зрыву германскай адукацыйнай палітыкі. Большая частка падрастаючага пакалення Беларусі не прыняла нацысцкую ідэалогію і актыўна ўдзельнічала ў патрыятычным супраціўленні германскім агрэсарам.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца асабістай працай аўтара. Даследаванне абапіраецца на раней невядомыя архіўныя дакументы і матэрыялы, аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмеркавана на пасяджэнні кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі і рэкамендавана да абароны. Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання прайшлі апрабацыю на 4-х навукова-тэарытычных, 2-х Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, 1-м Міжнародным кангрэсе.

**Апублікаванне вынікаў.** Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання выкладзены ў 12 навуковых артыкулах і тэзісах, змешчаных у часопісах і зборніках. Агульны аб'ём прац – 88 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з спіса ўмоўных скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, трох дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі – 212 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц прадстаўлены 733 найменнямі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва *ўводзінах* зроблены невялікі гістарычны экскурс, адзначана агульная ацэнка стану даследуемай праблемы, акрэслены яе храналагічныя рамкі, вызначаецца накірунак дысертацыйнага даследавання.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


*Агульная характарыстыка работы* складаецца з абгрунтавання актуальнасці тэмы, яе сувязь з навуковымі праграмамі, вызначэння мэт і задач, аб'екта і прадмета, металалогіі і метадаў даследавання. Характарызуецца навізна і практычная значнасць дысертацыі, фармулююцца асноўныя палажэнні, вынесеныя на абарону, а таксама выкладзены ўсе іншыя палажэнні згодна з патрабаваннямі ВАК Беларусі.

У *першай главе* "Гістарыяграфія праблемы і крыніцы" даецца агляд крыніц і літаратуры па тэме, характарызуюцца гістарычныя крыніцы і стан вывучэння праблемы, вызначаецца месца суіскальніка ў распрацоўцы тэмы. Адзначаецца, што нягледзячы на прысутнасць у гістарыяграфіі шэрагу прац у якіх асвятляюцца розныя аспекты адукацыйных працэсаў, спецыяльнага даследавання прысвечанага комплекснаму вывучэнню гэтай праблемы на сёняшні дзень няма. Пачатак асвятлення асобных аспектаў праблемы быў пакладзены яшчэ ў гады вайны. У шэрагу артыкулаў прапагандысцкага характару паказваецца каланізатарская сутнасць германскай адукацыйнай палітыкі, ёсць першыя звесткі аб дзейнасці савецкіх школ у тыле ворага[1].

У пасляваенны перыяд з'яўляецца першыя навуковыя даследаванні, у якіх гісторыкі зрабілі спробу асвятліць гісторыю дзейнасці савецкай школы ва ўмовах гітлераўскай акупацыі Беларусі, паказаць барацьбу настаўнікаў і навучэнцаў супраць захопнікаў, удзел беларускага народа ў аднаўленні цэнтраў культуры пасля вызвалення[2].

Першыя спробы барацьбы навуковага даследавання дзейнасці савецкіх школ у партызанскіх зонах, а таксама некаторым пытанням адукацыйнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад удзяліў А. І. Залескі[3]. Патрыятызм настаўнікаў і навучэнцаў, школьная справа на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны сталі тэмай шэрага навуковых прац П. М. Кабрынца[4]. Важнай з'явай у беларускай гістарыяграфіі з'явілася манаграфія В. П. Раманоўскага, а таксама яго доктарская дысертацыя[5].

Пачынаючы з 80-х гг. значна пашыраецца дыяпазон вывучэння адукацыйнай праблемы перыяду вайны. Звяртае на сябе ўвагу манаграфія С. А. Умрэйкі, А. І. Залескага і П. М. Кабрынца "Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов"[6]. Выкарыстоўваючы архіўныя матэрыялы, гісторыкі паспрабавалі раскрыць школьную палітыку гітлераўцаў у Беларусі, грунтоўна асвятлілі знішчэнне савецкіх навучальных устаноў, забойства настаўнікаў і вучняў, дэталёва асвятлілі працэс навучання дзяцей у партызанскіх краях і зонах, а таксама ў населеных пунктах, якія кантраляваліся захопнікамі. У манаграфіі

---

[1] Антонаў П. У беларускіх школах – нямецкія канюшні // Савецкая Беларусь.– 1942.– 11 сак.– С. 2; Горбунов Т. Гитлеровцы – душители национальной культуры // Славяне.– 1943.– № 1.– С. 10–14; Осоков А. Фашизм – смертельный враг народного образования.– Саранск: Мордгиз, 1942.– 37 с.; Паўлюк Н. Гітлераўцам не анямечыць беларускіх дзяцей // Савецкая Беларусь.– 1942.– 27 мая ; Чорны К. У імя будучыні // Савецкая Беларусь.– 1941.– 7 ліст.– С. 3 і інш.

[2] Саф'ян Г. Беларуская культура і нямецка-фашысцкія "культуртрэгеры" // Беларусь.– 1947.– № 10.– С. 28–29; Макаревич М. В. Советская школа в партизанских зонах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны // Учен. зап. Мин. пед. ин-та.– 1955.– Вып. 4.– С. 3–19; Аблова Р. Это было в Белоруссии.– М.: Мол. гвардия, 1957.– 192 с. і інш.

[3] Залескі А. На дарогах партызанскай Брэстчыны.– Мн.: Беларусь, 1964.– 51 с.; Залескі А. Падарожжа ў суровае мінулае.– Мн.: Беларусь, 1960.– С. 79–90 ; Залескі А. І. Быт беларускіх сялян у партызанскім краі.– Мн.: АН БССР, 1960.– 210 с. і інш.

[4] Кабрынец П. Крах "новых асветніцкіх парадкаў" // Народная асвета.– 1975.– № 7.– С. 78–82; Кобринец П. П. Школа, учитель и учащийся Белоруссии в период Великой Отечественной войны (1941–1945): Дис. ... канд. пед. наук.– Мн.: БГУ, 1972.– 151 с.

[5] Раманоўскі В. П. Саўдзельнікі ў злачынствах.– Мн.: Беларусь, 1964.– 288 с.; Романовский В. Ф. Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941–1944 гг.): Автореф. дис. ... д-ра ист. наук (07.00.02) / АН БССР. Отд-ние обществ. наук.– Мн., 1974.– 46 с.

[6] Умрейко С. А., Залесский А. И., Кобринец П. П. Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов.– Мн.: БГУ, 1980.– 174 с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



загадаў у адукацыйнай сферы, ваеннае кіраўніцтва не забараняла ўладам на месцах распачынаць школьную справу [2; 7].

3. Ужо ў пачатку дзейнасці германскай грамадзянскай улады на захопленай тэрыторыі Беларусі былі праведзены мерапрыемствы па наладжванні акупацыйнай сістэмы адукацыі, стварэнні яе органаў кіравання. Улады нацысцкай Германіі бачылі ў школьнай сістэме інстытут, які павінен быў пазбавіць падрастаючае пакаленне Беларусі ўплыву камуністычнай ідэалогіі і выхаваць яго ў духу германскага нацыянал-сацыялізму, уцягнуць беларускую моладзь у сферу германскіх ваенна-эканамічных інтарэсаў. Падрастаючае пакаленне са сваімі яшчэ не сфарміраваўшыміся жыццёвымі каштоўнасцямі і ідэаламі з'яўлялася найбольш прывабным для германскіх палітыкаў. Яно павінна было стаць апорай у працэсе здзяйснення экспансіўнай палітыкі Германіі на ўсходніх тэрыторыях.

Нямецкія ўлады ставілі перад сабой тры задачы ў справе арганізацыі сістэмы адукацыі: 1) стварыць умовы для хутчэйшага анямечвання беларускай моладзі; 2) фактам арганізацыі школ і сярэдніх навучальных устаноў адвесці ўвагу патрыятычна настроенай моладзі ад вызваленчага руху і такім чынам прыцягнуць яе нібыта да вырашэння задач духоўнага, культурнага і нацыянальнага развіцця; 3) падрыхтаваць рабочую сілу для "германскага рэйха" за кошт маладога пакалення [2; 3; 4; 6; 7].

4. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана сетка курсаў і навучальных устаноў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў. Новая генерацыя педагогаў павінна была авалодаць не толькі спецыяльнымі ведамі, але ў першую чаргу засвоіць ідэі нацыянал-сацыялізму, методыку яго ўкаранення ў навучальна-выхаваўчы працэс [3].

5. Разбудова школьнай сістэмы адукацыі павінна была спрыяць фарміраванню лаяльнасці беларускага насельніцтва да ўсталяваўшайся ўлады. Пры падтрымцы калабарацыяністкіх колаў германскія акупацыйныя ўлады здолелі наладзіць працу пачатковых, сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў. З іх дапамогай нямецкія палітыкі планавалі ўцягнуць маладое пакаленне Беларусі ў сферу германскіх інтарэсаў і тым самым стварыць перадумовы для экспарту ідэй нацыянал-сацыялізму. Колькасць адукацыйных устаноў абмяжоўвалася развіццём ваенна-палітычнай сітуацыі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, значным уплывам барацьбы партызан і падпольшчыкаў супраць германскіх агрэсараў.

Навучальна-выхаваўчы працэс меў адметную нацыянальна-прапагандысцкую афарбоўку і нацысцкую сутнасць, быў накіраваны на падрыхтоўку неабходных акупантам ваенна-эканамічнах кадраў [2; 4; 6; 8].

6. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі разгарнулася вострая ідэалагічная і ўзброеная барацьба за падрастаючае пакаленне. Падпольныя партыйныя і камсамольскія органы і арганізацыі прыкладвалі вялікія намаганні, каб падарваць германскую адукацыйную палітыку. У партызанскіх зонах былі арганізаваны і дзейнічалі школы, у якіх навучанне адбывалася па савецкіх праграмах, выхаваўчы працэс будаваўся на грунце камуністычных ідэй, нянавісці да германскіх акупантаў, адданасці сацыялістычнай Радзіме. Праца школ садзейнічала ідэйнаму згуртаванню і арганізаванасці, дапамагала ўцягваць моладзь Беларусі ў барацьбу з ворагам.

Мэтанакіраваная дзейнасць партызан і падпольшчыкаў садзейнічала зрыву германскай адукацыйнай палітыкі. Большасць падрастаючага пакалення Беларусі не

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

ўспрыняла нацысцкую ідэалогію. актыўна аказвала супрацоўленне агрэсарам. Масавы тэрор, які ўчынілі карныя органы на тэрыторыі Беларусі, ліквідаваў нават самыя прывабныя, на думку германскіх лідэраў. "асветніцкія ідэі" [3; 10; 12].

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ АЎТАРА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


1. Жылінскі М. Г. Знішчэнне гістарычнай і культурнай спадчыны Беларусі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі (1941 - 1944 гг.) // Гісторыя Беларусі: новае ў даследванні і выкладанні. Матэрыялы Рэспуб. Навукова-практычнай канферэнцыі. – Ч. 1. – Мн., 1999. – С. 125–127.
2. Жылінскі М. Г. Сутнасць палітыкі нямецкіх акупацыйных улад у галіне школьнай адукацыі на Беларусі (1941 – 1944 гады) // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў. – Ч. 2. Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі. – Мн., 2000. – С. 102–111.
3. Жылінскі М. Г. Інспектарыят беларускіх школ пры Генеральным камісарыяце Беларусі. Структура і дзейнасць // Весці БДПУ імя М. Танка. – 2000. – № 4. С. 100–104.
4. Жылінскі М. Г. Палітыка нямецкіх акупацыйных улад на Беларусі ў галіне адукацыі (1941 - 1944 гг.) // Весці БДПУ імя М. Танка. – 2001. – № 1. – С. 134–137.
5. Жылінскі М. Г. Разбурэнне сістэмы народнай асветы Беларусі ў час нямецкай акупацыі (1941 – 1944 гг.) // Гісторыя праблемы выкладання. – Мн., 2001. – № 1. – С. 62–69.
6. Жылінскі М. Г. Арганізацыя школьнай справы на тэрыторыі Баранавіцкай акругі (1941 – 1942 гг.) // 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцыпцыі і падыходы. Матэрыялы навукова-тэарытычнай канферэнцыі. - Мн., – 2001. – Ч. 1. – С. 40–44.
7. Жылінскі М. Г. Палітыка акупацыйных улад у няскоранай Беларусі // Народная асвета. – Мн., 2001. – № 5. – С. 78–83.
8. Жылінскі М. Г. Вільгельм Кубэ і беларуская калабарацыя // Весці БДПУ імя М. Танка. – Мн., 2001. – № 2. – С. 133–139.
9. Жылінскі М. Г. Эвакуацыя дзяцей з тэрыторыі Беларусі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны // Грамадазнаўчыя навукі: метадалогія, праблемы, перспектывы. Гісторыя, філасофія, паліталогія, эканоміка, культуралогія. /Пад рэд. А. А. Кавалені (гал. рэд.), Л. М. Давыдзенка (нам. гал. рэд.). Штогоднік. – Вып. 1. – 2001. – С. 42–51.
10. Жылінскі М. Г. Разбурэнне сістэмы народнай адукацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання. Зборнік навуковых прац у 2-х частках. /Пад рэд. А. М. Лютага (гал. рэд.) і інш. Ч. 1. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. – Мн., 2002. – С. 174–184.
11. Жылінскі М. Г. Сістэма народнай адукацыі Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны // Адукацыя і выхаванне. – Мн., 2002. – № 5. – С. 27–31.
12. Жылінскі М.Г. Аднаўленне савецкай агульнаадукацыйнай школы на Беларусі пасля нямецкай акупацыі 1941 - 1944 гг. // Весці БДПУ імя М. Танка. – Мн., 2002. – № 2. – С. 173–181.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## РЭЗЮМЭ

Жылінскі Марат Генадзьевіч

Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.)

Ключавыя словы: эвакуацыя, акупацыя, акупацыйныя ўлады, акупацыйны рэжым, акупацыйная палітыка, адукацыя, сістэма адукацыі, органы адукацыі, адукацыйная палітыка, школьныя ўстановы, ідэалогія, прапаганда, агітацыя, маладзёжная палітыка, падрастаючае пакаленне, настаўнікі, савецкая школа.

Аб'ект даследавання – гісторыя Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.), прадмет – германская акупацыйная і савецкая сістэмы адукацыі, іх асноўныя напрамкі дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў чэрвені 1941 – ліпені 1944 г. Ставіцца мэта – на аснове выкарыстання шырокага кола архіўных матэрыялаў і апублікаваных крыніц правесці комплексны і сістэмны аналіз працэсаў арганізацыі і дзейнасці германскай акупацыйнай і савецкай сістэм адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што ў ім упершыню на аснове раней не вядомых архіўных дакументаў паказаны генезіс і структура германскай сістэмы адукацыі, прыведзены новыя дадзеныя аб заснаванні і функцыянаванні аддзелаў культуры, адукацыі і напрамкі іх дзейнасці ў сферы навучальна-выхаваўчай работы. Адлюстравана дынаміка адукацыйных працэсаў, адносіны германскіх улад да падрастаючага пакалення, раскрыта ідэалагічнае барацьба германскіх акупацыйных улад і беларускіх партызан і падпольшчыкаў за моладзь Беларусі.

Вынікі праведзенага аўтарам даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшай распрацоўкі праблем па гісторыі адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пры выкладанні гісторыі Беларусі навейшага часу ў навучальных установах.



## РЕЗЮМЕ

Жилинский Марат Геннадьевич

Образование на оккупированной территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944 гг.)

Ключевые слова; эвакуация, оккупация, оккупационные власти, оккупационный режим, оккупационная политика, образование, система образования, органы образования, образовательная политика, школьные учреждения, идеалогия, пропаганда, агитация, молодежная политика, подростающее поколение, учителя, советская школа.

Объект исследования – история Беларуси периода Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944 гг.), предмет – германская оккупационная и советская системы образования, их основные направления деятельности на территории Беларуси в июне 1941 – июле 1944 гг. Цель работы – на основе использования широкого круга архивных материалов и опубликованных источников осуществить комплексный и системный анализ процессов создания и деятельности германской оккупационной и советской систем образования на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны.

Научная новизна диссертационного исследования заключется в том, что в нем впервые на основе ранее не известных архивных документов показан генезис и

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


структура германской системы образования, приведены новые данные о создании и функционировании отделов культуры, образования и направления их деятельности в сфере учебно-воспитательной работы. Выявлена динамика образовательных процессов, а также отношение германский властей к подрастающему поколению и идеологическая борьба германских оккупационных властей и беларуских партизан и подпольщиков за моладежь Беларуси.

Результаты исследования могут быть использованны для дальнейшей разработки проблем по истории образования на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны, при преподавании истории Беларуси новейшего времени в учебных учреждениях.


## SUMMARY

Marat G. Zhilinski

Public Education in the Occupied Territory of Belarus during Great Patriotic War.
(June 1941 – July 1944)

Key words: evacuation, occupation, occupation authorities, occupation regime, occupation policy, education, system of education, educational bodies, educational policy, school establishments, ideology, propagation, agitation, youth policy, growing up generation, teachers, Soviet school.

Object of research – history of Belarus in the period of Great Patriotic War (June 1941 – July 1944), subject – both Soviet and German occupation systems of education, their basic directions of activity in the territory of Belarus in June 1941 – July 1944. The purpose of the thesis – to execute complex and system analysis of processes of organization and activity both Soviet and German occupation systems of education in the territory of Belarus during Great Patriotic War on the basis of wide circle of archival materials and published sources.

The point of the scientific novelty of the thesis is that it has demonstrated for the first time genesis and structure of German system of education, new facts about creation and functioning of the departments of culture, education and the directions of their activity in the sphere of teaching and educational work on the basis of rich documentary materials which were unknown earlier. The thesis has shown dynamic of education processes, relation of the German authorities to the growing up generation, ideological struggle between German occupation authorities and Belarussian partisans and undergrounders for youth of Belarus.

The conclusion of the research can be used for the further elaboration of problems on the history of education in the Belarus during Great Patriotic War, as well as for teaching Belarussian history of the modern times at the educational institutions.


